У. Е. Снапкоўскі

# ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІ

Задачай навуковай і вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» з'яўляецца вывучэнне гісторыі знешнепалітычнай дзейнасці беларускіх дзяржаў і дзяржаўных утварэнняў, планаў і палітыкі іншых дзяржаў адносна Беларусі, знешнепалітычнага працэсу і механізму ў федэратыўных і унітарных дзяржавах, у склад якіх уваходзілі беларускія дзяржавы і тэрыторыі, знешнепалітычных праектаў беларускага вызваленчага руху і беларускай дыяспары, геапалітычных і культурна-цывілізацыйных фактараў, якія ўплывалі на міжнароднае становішча, знешнюю палітыку і дыпламатыю Беларусі.

Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі – гэта арганічная састаўная частка гісторыі беларускага народа, якая налічвае не адно тысячагоддзе і прадстаўляе сабой важную частку еўрапейскай і сусветнай гісторыі. Як гістарычная дысцыпліна, «Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі» патрабуе выдзялення ў храналагічнай паслядоўнасці асноўных перыядаў знешнепалітычнай актыўнасці беларускіх дзяржаў. У адпаведнасці з гістарычнымі формамі беларускай дзяржаўнасці гісторыю знешняй палітыкі Беларусі можна падзяліць на наступныя перыяды:

***Першы перыяд*** – знешняя палітыка старажытнабеларускіх дзяржаў-княстваў (IX – сярэдзіна XIII ст.). Ужо ў першым перыядзе гісторыі беларускай дзяржаўнасці вызначыліся геапалітычныя мэты і знешнепалітычныя інтарэсы Беларусі. Па-першае, гэта адносіны з усходнеславянскім светам, з дзяржавамі-княствамі Кіеўскай Русі (усходні вектар). Па-другое, гэта адносіны з дзяржавамі і народамі Цэнтральнай, Заходняй і Паўночнай Еўропы (Польшчай, Нямецкім ці Тэўтонскім ордэнам, народамі Балтыі). Тады ж у асноўных рысах сфарміравалася і геапалітычная традыцыя беларускай дзяржаўнасці. Яе сутнасць – балансаванне паміж Усходам і Захадам, недапушчэнне празмернага крэну ні да аднаго з бакоў. Неабходнасць геапалітычнага і цывілізацыйнага балансу для беларускай дзяржаўнасці вызначалася і ўнутранай структурай беларуска-літоўскага грамадства і дзяржаўнасці (пасля ўзнікнення ВКЛ), для якога былі ўласцівыя паліэтнічнасць і паліканфесіянальнасць. З пункту гледжання знешнепалітычных падзей у гэтым перыядзе выдзяляецца першая палова XIII ст. У гэты час пачынаецца актыўная экспансія нямецкіх рыцараў ва Усходнюю Прыбалтыку, заключаюцца першыя міжнародныя дагаворы і пагадненні Полацка, Віцебска і Смаленска з Рыгай і ганзейскімі гарадамі, узнікае пагроза беларускім землям з боку татара-мангольскага нашэсця. На тэ-

рыторыі Беларусі і Літвы разгортваюцца дзяржаваўтваральныя працэсы, якія прывялі да стварэння Вялікага Княства Літоўскага;

***Другі перыяд*** – знешняя палітыка Вялікага Княства Літоўскага (сярэдзіна XIII – канец XVIII ст.). Гэты перыяд падзяляецца на два надперыяды: 1) знешнепалітычная дзейнасць ВКЛ ад стварэння дзяржавы ў сярэдзіне XIII ст. да Люблінскай уніі 1569 г.; 2) знешнепалітычная дзейнасць ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай (1569 – 1795 гг.). Галоўны змест знешнепалітычнай дзейнасці ВКЛ на працягу больш чым пяці стагоддзяў яго гісторыі – гэта станаўленне, тэрытарыяльная экспансія, росквіт, заняпад і знікненне Беларуска-Літоўскай дзяржавы як аднаго з найбольш актыўных і ўплывовых удзельнікаў міжнародных адносін ва Усходняй Еўропе.

Першы надперыяд падзяляецца на два этапы. На працягу першага этапа (сярэдзіна XIII – 1430 год) адбывалася станаўленне, умацаванне і актыўная тэрытарыяльная экспансія ВКЛ, у выніку чаго Беларуска-Літоўская дзяржава пераўтварылася ў канцы жыцця Вітаўта Вялікага ў наймагутнейшую дзяржаву Усходняй Еўропы. Другі этап гэтага надперыяду ахоплівае часы тэрытарыяльна-палітычнай стабілізацыі ВКЛ, яго адступленне пад націскам Маскоўскай дзяржавы з памежных расійска-беларускіх тэрыторый, нарастанне знешнепалітычнай актыўнасці на заходнім, еўрапейскім накірунку (1430–1569 гг.). Гэты этап завяршаецца аб'яднаннем ВКЛ з Польшчай і ўтварэннем Рэчы Паспалітай. Важнай падзеяй у гісторыі ВКЛ быў пераход у 1566 г. украінскіх зямель, якія ўваходзілі ў яго склад з часоў Гедыміна і Альгерда, да Польшчы, што многія гісторыкі разглядаюць як «інкарпарацыю».

Другі надперыяд гэтага перыяду таксама падзяляецца на два этапы. Першы этап ахоплівае час ад Люблінскай уніі да «вечнага міру» 1686 г. паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй і характарызуецца паступовай стратай знешнепалітычных пазіцый ВКЛ у Польска-Літвінскай федэрацыі і, адпаведна, у сістэме еўрапейскіх міжнародных адносін. Другі этап гэтага надперыяду (1686–1795 гг.) характэрны знікненнем ВКЛ з арэны еўрапейскай палітыкі, што адбылося пасля заключэння дагавораў ВКЛ з Расіяй у пачатку Паўночнай вайны 1700–1721 гг. У апошнія гады існавання Рэчы Паспалітай магнацтва і шляхта ВКЛ рабілі спробы канстытуцыйна замацаваць самастойны статус сваёй дзяржавы ў Польска-Літвінскай федэрацыі, якая ўсё больш пераўтваралася ва унітарную «Польскую Рэч Паспалітую».

***Трэці перыяд*** – знаходжанне Беларусі ў складзе Расійскай імперыі (канец XVIII ст. – 1917 г.). Беларусь, пазбаўленая пасля падзелаў Рэчы Паспалітай сваёй дзяржаўнасці, з'яўлялася ў гэты перыяд не суб'ектам, а аб'ектам знешняй і ваеннай палітыкі іншых дзяржаў. Геапалітычнае становішча Беларусі вызначалася яе месцам і роллю заходняга фарпосту велізарнай еўраазіяцкай імперыі. Акты-

візацыя дыпламатычнай актыўнасці вакол тэрыторый былога ВКЛ і Беларусі была звязана з ваенна-палітычнымі і геастратэгічнымі планамі буйных еўрапейскіх дзяржаў (Расіі, Францыі, Прусіі, Аўстрыі) у час напалеонаўскіх войн, што знайшло адлюстраванне ў праектах аднаўлення Рэчы Паспалітай і ВКЛ (праекты М.Агінскага і А.Чартарыйскага). Пасля руска-французскай вайны 1812 г. беларускія землі больш стагоддзя, да 1915 г., развіваліся ў мірных умовах. У гады першай сусветнай вайны, асабліва пасля акупацыі значнай часткі Беларусі войскамі кайзераўскай Германіі, яна зноў стала аб'ектам знешнепалітычнай зацікаўленасці нямецкай дзяржавы.

Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, які ўзняўся на новы ўзровень пасля паўстання 1863–1864 гг., вылучаў знешнепалітычны кампанент у сваіх праектах адраджэння дзяржаўнасці Беларусі. У 1916 г. «беларускае пытанне» як праблема прыгнечанага становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі і вызваленчай барацьбы за аднаўленне дзяржаўнасці было пастаўлена беларускімі палітычнымі дзеячамі як міжнародная праблема на форумах народаў (нацый) Расіі ў Лазане і Жэневе;

***Чацвёрты перыяд*** – знешнепалітычная дзейнасць Беларускай Народнай Рэспублікі і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі як новастворaных беларускіх дзяржаў (1918 – 1991 гг.). Паколькі ні БНР, ні БССР у выніку неспрыяльнага збегу ўнутраных і знешніх фактараў не пераўтварыліся ў паўнавартасныя (суверэнныя і незалежныя) сучасныя дзяржавы, то яны не праводзілі сапраўднай знешняй палітыкі ў класічным разуменні гэтага тэрміну. Гэты перыяд знешнепалітычнай актыўнасці дзвюх беларускіх дзяржаў падзяляецца на некалькі этапаў.

Знешнепалітычная актыўнасць БНР праяўлялася пераважна ў дыпламатычнай сферы і ахоплівала кароткі гістарычны адрэзак 1918 – 1925 гг. Яго большую частку, пачынаючы з 1920 г., Рада, урад БНР і звязаныя з імі палітычныя партыі дзейнічала ва ўмовах эміграцыі. Гэта аказала вырашальны ўплыў на дзяржаўна-палітычны статус БНР, праблематычнасць яе міжнароднага прызнання, формы і характар дыпламатыі новастворанай беларускай дзяржавы. Рада БНР як сімвал беларускай дэмакратычнай дзяржавы працягвае сваю дзейнасць у эміграцыі.

Знешнепалітычная дзейнасць БССР падзялялася на тры этапы: 1) 1919 – 1923 гг., ад абвяшчэння БССР да яе ўваходжання ў СССР і ліквідацыі Наркамата замежных спраў рэспублікі (НКЗС); 2) 1923 – 1944 гг., ад перадачы знешнепалітычных паўнамоцтваў БССР саюзным органам да аднаўлення гэтых паўнамоцтваў і рэспубліканскага НКЗС; 3) 1944 – 1991 гг., ад вяртання БССР знешнепалітычных паўнамоцтваў і яе абмежаванага выхаду на міжнародную арэну як саюзнай рэспублікі і адначасова члена ААН да распаду СССР. Гіста-

рычная роля Беларускай ССР заключаецца ў тым, што, праіснаваўшы больш 70 гадоў, яна стала аўтэнтычнай тэрытарыяльнай, эканамічнай і этнічнай базай для незалежнай Рэспублікі Беларусь;

***Пяты перыяд*** знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь як новай незалежнай дзяржавы (з 1991 г па сённяшні дзень). Больш чым 10-гадовы вопыт самастойнага існавання суверэннай Беларусі паказвае, што Рэспубліка Беларусь адбылася як еўрапейская дзяржава з уласнымі геапалітычнымі традыцыямі, нацыянальнымі інтарэсамі і знешнепалітычнымі прыярытэтамі. Разам з тым пагрозы і выклікі сучаснага свету, геапалітычнае становішча Беларусі на скрыжаванні інтарэсаў вялікіх, сярэдніх і малых дзяржаў Еўропы, Еўразіі і Паўночнай Амерыкі, цяжкасці трансфармацыйных працэсаў, што адбываюцца ў краіне, усё яшчэ не завершаныя пошукі нацыянальнай і міжнароднай ідэнтычнасці Беларусі патрабуюць ад грамадзян Рэспублікі Беларусь умацоўваць суверэнітэт і незалежнасць сваёй дзяржавы, настойліва рухаць яе па шляху дэмакратычных і рынáчных пераўтварэнняў.

А. В. Сонин

## МЕЖДУНАРОДНОЕ ЧЕРНОБЫЛЬСКОЕ СОТРУДНИЧЕСТВО КАК ОДИН ИЗ ПРИОРИТЕТОВ ВНЕШНЕЙ ПОЛИТИКИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

Произошедшая 26 апреля 1986 года авария на 4-ом реакторе Чернобыльской АЭС в Украинской ССР привела не только к широкомасштабному радиоактивному загрязнению окружающей среды и возникновению медико-социальных и экономических проблем в наиболее пострадавших государствах, но и стала фактором, оказавшим существенное влияние на изменение геополитической обстановки в регионе. В Республике Беларусь чернобыльская проблематика давно стала значимой составляющей как внутренней, так и внешней политики. В Декларации о государственном суверенитете БССР говорится: «Свою свободу и суверенитет Белорусская ССР, в первую очередь, использует на спасение народа Белорусской ССР от последствий чернобыльской катастрофы».

Внутри страны эта, несомненно, актуальная, тема зачастую используется в интересах различных политических сил. Практически ни одно выступление как официальных, так и неофициальных представителей Беларуси за рубежом не обходится без упоминания, в той или иной форме, проблем, порожденных чернобыльской аварией, что является закономерным отражением внутренней политики страны в зеркале международной жизни. Это ставит вопрос о внешнепо-